# «ФАТАГРАФАВАННЕ – ЧАСТКА ЖЫЦЦЯ»

***ВІЯЛЕТА ГУСЕВА, студэнтка 2 курса педагагічнага факультэта нашага ўніверсітэта, перамагла ў Рэспубліканскім конкурсе «Сэлфі&фота з вышыванкай». Дзяўчына стала аўтарам лепшых фатаграфій у адзенні з нацыянальным арнаментам, якія былі надрукаваныя ў новым нумары газеты «Знамя юности», што выйшаў напярэдадні Дня Незалежнасці нашай краіны.***



На фотаздымку: Віялета Гусева.



Фотаздымак размешчаны ў газеце «Знамя юнасці».

«Мае бацькі бачылі, што мне падабаецца фатаграфаваць і вырашылі дапамагчы – пяць гадоў таму яны купілі мне фотаапарат. З таго моманту я і пачала ўдасканальваць свае ўменні і навыкі ў гэтым занятку, – расказала Віялета. – Пра конкурс я даведалася ад першага сакратара ГА ПА «БРСМ» нашага ўніверсітэта Марыі Крупскай і вырашыла паспрабаваць свае сілы. Да гэтага я ніколі не ўдзельнічала ў такіх конкурсах, а проста фатаграфавала людзей».

У выніку фатаграфіі атрымаліся маляўнічымі, яркімі і стыльнымі. Віялета была ўпэўнена, што яе работы абавязкова будуць ацэнены па вартасці. Трэба адзначыць, што рэалізацыя арыгінальнай задумкі ажыццявілася за адзін дзень.

«Больш за ўсё мне запомніўся вобраз сялянскай дзяўчыны са збанам малака ў бярозавым гаі, але ж і астатнія фатаграфіі мне таксама вельмі падабаюцца, – расказала студэнтка.– У мяне ёсць шмат ідэй, якія я спрабую рэалізаваць».

Віялета заўсёды рада знаёмствам з новымі людзьмі. Адкрытая і камунікабельная дзяўчына без праблем знаходзіць падыход да кожнага.

«Галоўнае для мяне пасля знаёмства – усталяваць кантакт. Я заўсёды падбадзёрваю чалавека, якога збіраюся фатаграфаваць. Магу нават папрасіць уключыць яго любімую музыку, бо гэта расслабляе. Мне падабаецца працаваць з творчымі людзьмі, смелымі і эмацыйнымі. Гэта дапамагае ў працэсе стварэння прыгожых фотаздымкаў. Але фатаграфую ўсіх, бо кожны індывідуален і мае свае непаўторныя рысы характару і паводзіны», – адзначыла дзяўчына.

На думку Віялеты, беларускія арнаменты выглядаюць прыгожа і стыльна. Але ў гардэробе дзяўчыны народнага строю няма, бо яна лічыць, што ён больш падыходзіць для розных святаў ці мерапрыемстваў.

А яшчэ студэнтка любіць падарожнічаць. Яна ўжо пабывала ў Польшчы, Францыі, Празе, Германіі, Украіне і Расіі.

«Для мяне, як для фатографа, падарожжы, у першую чаргу, – гэта натхненне. Мне падабаецца знаходзіць новыя прыгожыя пейзажы. А яшчэ падчас падарожжа ты атрымліваеш новы вопыт, заводзіш знаёмствы з цікавымі людзьмі», – расказала Віялета.

Сваю будучыню студэнтка плануе звязаць з фатаграфаваннем, а яшчэ ў яе планах наведаць як мага больш краін, знайсці там нешта прывабнае і абавязкова захаваць гэта на фатаграфіях.

«Фатаграфаванне для мяне – ужо частка жыцця. Адмовіцца ад яго немагчыма», – падагульніла Віялета.

**Дар'я КАЛАКОЛЬЦАВА,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**

**ВПЕЧАТЛЕНИЯ**

# ЭХО ЛЕТА

***ИРИНА НИКОЛАЕВНА ГЛАДКАЯ, старший преподаватель кафедры дошкольного и начального образования педагогического факультета нашего университета, поделилась своими самыми теплыми летними воспоминаниями.***



Прошлым летом она вместе с мужем путешествовали по Астраханской области (Россия). К слову, в Казани родился ее отец, а сегодня живут родственники. В детстве И.Н. Гладкая ездила туда каждое лето.

Ирина Николаевна считает Казань очень красивым городом с интересными достопримечательностями. К примеру, Казанский кремль – древнейшая часть города, где расположены белокаменный кремль, несколько храмов, музеи и официальная резиденция президента Республики Татарстан. Также путешественникам стоит увидеть построенную под заметным наклоном «падающую» башню Сююмбике и главную мечеть Татарстана – Кул-Шариф, а еще прогуляться по пешеходной улице Баумана.

Можно посетить и Богдинско-Баскунчакский заповедник, где находится гора Большое Богдо. Это наивысшая точка Прикаспийской низменности, с которой открывается красивый вид на типичный ландшафт полупустыни.

«Необычные ощущения мы получили от купания в рапе на озере Баскунчак. Вода там настолько соленая, что просто выталкивает тебя на поверхность, а когда ты выходишь на берег, то сразу же покрываешься солью», – рассказала И.Н. Гладкая.

Ирина Николаевна считает, что летом обязательно нужно отдохнуть и отправиться в путешествие, даже если нет возможности выехать куда-то за пределы нашей страны. И в Беларуси есть много красивых и необычных мест. Так, в последние годы ее семья выбирается на несколько дней в Браславский район.

**Алеся МЯДИЛЬ.**